выпускниках, центральное место в музее занимает стенд, рассказывающий о ветеранах войны, работавших в университете. Преподаватели, работники БИМСХ-БГАТУ – ветераны войны – встречались с молодежью, передавали в музей ценные экспонаты. Так, после смерти в П.А. Путинцева (работал начальником отдела кадров) его дочь передала в музей грамоты, благодарности, семейный альбом. Профессор, лауреат Государственной премии СССР, участник войны И.Р. Размыслович, был не только талантливым ученым в области сельскохозяйственного машиностроения, но еще и творческой личностью. Его стихи часто публикуются в газете «Агроинженер». В разные годы в БИМСХ-БГАТУ работало более 100 ветеранов Великой Отечественной войны, изданы альманахи, книга «Стоявшие насмерть во имя жизни», ежегодно накануне Дня Победы организуются торжественные мероприятия с участием ветеранов, постоянно они приглашаются на встречи со студентами, волонтеры БГАТУ оказывают необходимую помощь по запросу ветеранов.

Великая Отечественная война оставила трагический след в истории нашей страны. Проходят годы, сменяются поколения, историю не перепишешь, не терпит она сослагательного наклонения. Музеи Беларуси как эстафетную палочку передают из поколения в поколение историю о событиях, о героях той жестокой войны. Музеи Беларуси – неотъемлемая составная часть национальной культуры, они способствуют формированию духовного развития и гражданского самосознания, воспитывает любовь к родному Отечеству и гордость к своей истории и культуре.

## СПИСОК ИСПОЛЬЗОВАННОЙ ЛИТЕРАТУРЫ

1. Здасюк, Н.М. Новые подходы к исследованию деятельности музеев Беларуси в 1990-е гг. // Веснік БДУ. Сер.3. Гісторыя. – 2004.
2. Боровко, Л.В. Музей истории Белорусского государственного аграрного технического университета: буклет. – Мн.: БГАТУ, 2006.

УДК 37.01:94

С. В. Мяньчэня



Репозиторий БГАТУ

# ВОПЫТ ВЫКАРЫСТАННЯ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ МІНСКА Ў МЕЖАХ ВЫКЛАДАННЯ ДЫСЦЫПЛІНЫ “ВЯЛІКАЯ АЙЧЫННАЯ ВАЙНА САВЕЦКАГА НАРОДА (У КАНТЭКСЦЕ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ)”

Падзеі Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай вайны займаюць важнае месца ў дзяржаўнай ідэалогіі Рэспублікі Беларусь. З імі звязаны галоўныя дзяржаўныя святы (Дзень Незалежнасці, Дзень Перамогі) і мясцовыя памятныя даты (большасць гарадоў Беларусі адзначае Дні горада ў сувязі з вызваленнем ад нямецкіх захопнікаў). Гэта ў пэўнай ступені абумоўлівае тую увагу, якая надаецца вывучэнню падзей вайны ў сістэме сярэдняй і вышэйшай адукацыі.У Беларускім дзяржаўным аграрным тэхнічным універсітэце ім прысвечаны 4 з 34 аўдыторных гадзін дысцыпліны “Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі” і факультатыў “Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)”.

Аднак такая ўвага да вайны мае і адваротны бок – студэнты выказваюцца, што з пытаннямі вайны яны і так знаёмы, і што выкладчыкі ніякай карыснай, цікавай і новай інфармацыі ім не давядуць. Але ўжо пад час правядзення ўваходнага кантроля ведаў высвятляецца, што з ведамі студэнтаў існуюць пэўныя праблемы. Студэнты не могуць дакладна вызначыць часовыя рамкі вайны, не ўсведамляюць яе маштабы і краін-удзельніц. Так, да краін-саюзніц Германіі, пад уздзеяннем ненавуковай і прапагандысцкай інфармацыі і інтэрпрэтацыі сучасных палітычных падзей, залічваюцца ЗША, Латвія, Літва, Эстонія і Ўкраіна. Акрамя гэтага трэба адзначыць, што падзеі вайны ўвогуле і асабліва на тэрыторыі Беларусі слаба персаніфіцыраваны. Студэнты з цяжкасцю могуць назваць 2 – 3 асобы герояў вайны, якія б былі звязаны з Беларуссю. Так, негледзячы на тое, што частка ўніверсітэцкага гарадка размяшчаецца на вуліцы М. Кедышкі, і студэнты часта чуюць гэтае імя, а некаторыя і жывуць на гэтай вуліцы, адказаць на пытанне, чым знакаміты Мікалай Кедышка, не можа каля 80 % навучэнцаў. Не адзначаецца разнастайнасцю і пералік вядомых ім мемарыяльных комплексаў. Пераважная большасць студэнтаў назвае Плошчу Перамогі, Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, комплексы “Хатынь”, “Брэсцкая крэпасць”. Але калі ўзнікае



Репозиторий БГАТУ

пытанне з апісаннем комплекса на Плошчы Перамогі, то і тут пачынаецца блытаніна. Амаль не вядомы студэнтам пахаванні ў брацкіх магілах у парку Чалюскінцаў і на бульвары Талбухіна, якія знаходзяцца на адлегласці аднаго жылога квартала ад БДАТУ.

Менавіта на выкладчыка кладзецца вялікая адказнасць у развейванні міфаў, звязаных з вайной, і вырашэнні вышэй адзначаных праблем. У гэтых умовах важна пазбягаць фармалізму ў выкладанні, калі правядзенне заняткаў зводзіцца да прагляду фільмаў ці зачытвання паведамленняў. Трэба пазбягаць у працэсе выкладання залішняга афіцыёзу, перанасычанасці сухой статыстычнай інфармацыяй і іншых падобных памылак. У вырашэнні дадзеных праблем дапамогу можа аказаць выкарыстанне аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны, якія дазваляюць візуалізаваць працэс навучання і зрабіць яго цікавым і непаўторным.

Сталіца Беларусі мае значную колькасць помнікаў, мемарыялаў, звязаных з падзеямі вайны. Важнае месца ў выкладанні Вялікай Айчыннай вайны займае арганізацыя экскурсій у Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, які з 2 ліпеня 2014 г. адкрыў свае дзверы ў новым будынку на прашпекце Пераможцаў. Аднак гэты від працы не з'яўляецца ў гэтым накірунку.

Адной з форм працы па выкарыстанню гісторыка-культурнай спадчыны могуць стаць пазааўдыторныя заданні, звязаныя з пошукам гістарычных аб'ектаў. Значная колькасць мемарыялаў, прысвечаных дзейнасці мінскага падполля таксама малавядомы шырокай грамадскасці. Да іх можна аднесці мемарыял на месцы пакарання смерцю дзеячаў мінскага патрыятычнага падполля, у тым ліку Ісая Казінца ў Аляксандраўскім скверы каля Кастрычніцкай плошчы, месца пагібелі рэдактара падпольнай мінскай газеты "Звязда" Уладзіміра Амельянюка непадалёк ад касцёла св. Сымона і Алены (Плошча Незалежнасці). Актыўна ўключаюцца студэнты ў заданне гульнёвай формы "Ліквідацыя". Сэнс яе заключаецца ў пошуку аб'ектаў, якія могуць адносіцца да аперацыі па ліквідацыі гауляйтэра Беларусі Вільгельма Кубэ: будынак Дому Чырвонай Арміі (сучасны Дом Афіцэраў), загарадная рэзідэнцыя ў Лошыцкім парку, дзе ў снежні 1943 годзе падпольшчыцы Чыжэўскія зрабілі замах на жыццё новага



Рэпазіторый БГАТУ

гаўляйтэра Курта фон Готберга, дом па вуліцы Кілясёва, дзе пражывала Алена Мазанік і інш.

Цікавым і малавядомым аб'ектам з'яўляецца мемарыяльны знак на месцы правядзення партызанскага параду ў Мінску 16 ліпеня 1944 г. Сам парад шырока асвечаны ў навуковай вучэбнай літаратуры, а вось помнік на яго месцы губляецца ў ландшафце набярэжнай ракі Свіслач у раёне вуліцы Лодачнай. У зімовы час можа нават скласціся сітуацыя, калі мемарыял цалкам хаваецца пад снегам. Лакалізацыя падобных аб'ектаў дазваляе студэнтам далучыцца да гісторыі, і зразумець, што гісторыя гэта не толькі кнігі, гэта тое, што вакол нас. Для павышэння цікаўнасці студэнтаў можна ўвесці элементы спаборніцтва, залічваючы толькі некалькі першых адказаў.

Важнае значэнне мае і цэнтралізаванае наведванне мемарыялаў. У адрозненні ад наведванне Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, гэтыя мерапрыемствы не патрабуюць ад студэнтаў матэрыяльных укладанняў і на часе адпавядае працягласці аднаго занятку. Бліжэйшымі да БДАТУ мемарыяламі з'яляюцца брацкія магілы ў парке Чалюскінцаў і на бульвары Талбухіна. У асноўным у іх пахаваны вязні гарадскога аддзялення шталага № 352 Ausstellung (Выстава), створанага на месцы даваеннага комплекса сельска-гаспадарчай выставы (сёння тэрыторыя гадзіннікавага завода "Луч" і часткова жылы квартал паміж вуліцамі Талбухіна і Калініна). Адным з тых, каму пашчасціла вызваліцца адсюль быў будучы герой мінскага падполля Іван Кабушкін. Памерлых восенню і зімой 1941 –19 42 гг. (каля 10 000) палонных пахавалі ў брацкай магіле ўвесну 1942 г. на Пушкінскай вуліцы (каля д.91 на праспекце Незалежнасці). Каля 10 000 палонных пахавалі гэтай жа вясной 1942 г. ў брацкай магіле ў размешчаным побач парку ім. Чалюскінцаў. Час стварэннння брацкай магілы на сённяшнім месцы дакладна не вядомы, але згодна з некаторай інфармацыяй у 1955 г. сюды былі перанесены адзіночныя пахаванні з Першамайскага раёна сталіцы [1]. На брацкай магіле на. Талбухіна паказана, што ў ёй пахавана больш за 10000 савецкіх воінаў, партызан і мірных грамадзян, закатаваных і расстраляных нямецкімі захопнікамі, з іх 247 вядомых, імёны якіх знаходзяцца на бакавых плітах. Як бачна, тут не згадваецца не прыналежнасць загінуўшых да ваеннапалонных, назва лагера, месца і час яго існавання, дзе і як



Репозиторий БГАТУ

загінулі гэтыя палонныя і калі іх пахавалі ў гэтым месцы. Няма і асобнага памятнага знака пра існаванне тут лагера.

Адной з самых трагічных старонак вайны стаў яўрэйскага насельніцтва Беларусі. Толькі ў Мінскім гета знаходзілася каля 100000. яўрэяў з Беларусі, Польшчы, Чэхіі і Германіі. Сучасны мемарыял мінскага гета ўключае ў сабе шэраг помнікаў і памятных дошак. Гэта 3 мемарыяльных камня ў памяць яўрэям з Гамбурга, Брэмена і Дусельдорфа (перакрыжаванне вуліц Сухой і Калектарнай), будынак Гістарычнай майстэрні і рэшткі старых яўрэйскіх могілак. Аднак самым вядомым і эмацыянальным з'яўляецца комплекс "Яма" на злучэнні вуліц Мельнікайтэ і Заслаўскай. 2 сакавіка 1942 г. пад час яўрэйскага свята Пурым у гета прайшоў масавы пагром, схопленых падводзілі да яра на ўскрайку гета і расстрэльвалі. У 1947 г. на сродкі яўрэйскай абшчыны ў Мінску тут быў усталяваны помнік, першы ў Савецкім Саюзе прысвечаны ахвярам Халакоста. На чорным гранітным мануменце быў выбіты надпіс на рускай мове і ідышы (таксама адзінкавы выпадак) "Светлая памяць на вечныя часы пяці тысячам яўрэяў, якія загінулі ад лютых ворагаў чалавецтва – нямецка-фашысцкіх злодзеяў. 2 сакавік 1942". У народзе помнік атрымаў назву "Яма". На доўгі час гэтая пляцоўка стала месцам сустрэч яўрэйскай грамадскасці Мінска. У 90-я гг. каля помніка была высажана Алея Праведнікаў Сусвету, прысвечаныя тым, хто пад пагрозай жыцця ратаваў яўрэяў, а ў 2000 г. комплеск быў дапоўнены скульптурнай кампазіцыяй "Апошні шлях".

Напрыканцы экскурсій выкладчыкі са студэнтамі звычайна наведваюць Плошчу Перамогі, якая з'яляецца сімвалам стойкасці і мужнасці народа, служыць памяццю аб выніках вайны і цане Перамогі. Безумоўна наведванне такіх месцаў аказвае на моладзь моцнае эмацыянальнае ўздзеянне і садзейнічае лепшаму ўспрыманню інфармацыі.

Трэба адзначыць, што паспяховасць дадзеных мерапрыемстваў залежыць ад асобы выкладчыка і яго кантакта са студэнтамі. Правядзенне экскурсій ў межах Мінска не ўлічваецца пры падліку рэйтынга выкладчыка, але пры гэтым патрабуе больш сіл і часу. Ва ўмовах скарачэння гадзін, якія адводзяцца на вывучэнне сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, фармалізацыі працэса выкладання факультатыва "Вялікая Айчынная вайна савецкага народа", а менавіта адсутнасць формы кантролю і выкладанне яго не



Репозиторий БГАТУ

паралельна з іншымі гістарычнымі дысцыплінамі, інтарэс студэнтаў да гуманітарных ведаў сніжаецца, як і шансы выкладчыка зацікавіць студэнтаў сваёй дысцыплінай. Спадзяемся, што дадзены вопыт будзе карысным пры правядзенні ідэалагічна-выхаваўчай работы па-за межамі навучальнага працэсу і будзе спрыяць фарміраванню грамадзянскай свядомасці моладзі і станаўленню пачуцця патрыятызму.

СПИСОК ИСПОЛЬЗОВАННОЙ ЛИТЕРАТУРЫ

1. Городское отделение шталага № 352 Ausstellung (Выставка) // Минск старый и новый [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.minsk-old-new.com/minsk-3440.htm. Дата доступа: 14.04.2015.

УДК 94: 37.035

Т. Б. Дианова

## ИЗУЧЕНИЕ ИСТОРИИ ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ КАК ИСТОЧНИК ПАТРИОТИЧЕСКОГО ВОСПИТАНИЯ ВУЗОВСКОЙ МОЛОДЕЖИ

70 лет назад закончилась самая жестокая война в истории человечества. Она унесла миллионы человеческих жизней, разбила семьи, разрушила города и села. События Великой Отечественной войны все дальше уходят в прошлое. Но мы должны доносить до молодого поколения граждан нашей страны объективную память об этом тяжелейшем, но героическом времени нашего народа. Преподавание спецкурса «Великая Отечественная война советского народа (в контексте второй мировой войны)» дает большие возможности для воспитания патриотических чувств и формирования идейно-нравственных основ личности.

Изучение истории второй мировой и Великой Отечественной войн невозможно без анализа феномена становления и развития фашизма, ставшего идеологической основой войны. Фашистская идеология стала в руках Гитлера инструментом территориальной экспансии, основой варварской, бесчеловечной политики геноцида. Фашизм, хотя и в измененном виде остается явлением современности, а, следовательно, и сегодня несет в себе угрозу.



Репозиторий БГАТУ